// Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1974. № 4; Ш ы р м а Р.Р. Музычная апрацоўка беларускіх мелодый // Ширма Р.Р. Песня — душа народа. Мн., 1976; Беларускія народныя песні (для хору) / Склад. Р.Р.Шырма. Т. 1—2. Мн., 1971—73.
*Т. Б. Варфаламеева.*

**АРАНЖЫРÓЎКА** (ад франц. arranger літар. прыводзіць у парадак, уладкоўваць), прыстасаванне пэўнага музычнага (аўтарскага ці нар.) твора да магчымасцей і асаблівасцей канкрэтнага выканаўчага калектыву ці саліста; асобны від творчай дзейнасці (часцей кіраўніка выканаўчага калектыву); адна з форм засваення нар. песенных і інструментальных традыцый. Вылучаюць 4 асноўныя віды А. нар. мелодый. Р а с п е ў «н а г а л а с ы» — у жывой выканальніцкай практыцы стварэнне падгалоскаў да асноўнага напеву (форма работы *Азершчынскага народнага хору, Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь* імя Г.І.Цітовіча ў першыя гады яго існавання), сучасная практыка дзейнасці дзіцячых і маладзёжных аматарскіх фалькл. калектываў, якія пераймаюць нар. спеўныя традыцыі вусным шляхам. М у з ы ч н а - т э к с т а в а е р э д а г а в а н н е — упарадкаванне голасавядзення ў партытуры (пры наяўнасці ў фалькл. творы складанага вар'іравання) з мэтай захавання і адлюстравання ў 2—3 страфах меладычных і ладагарманічных варыянтаў твора ў цэлым. А б л е г ч а н а е в ы к л а д а н н е — для дасягнення даступнасці пэўнага ўзору для выканаўцаў, тэхнічныя і мастацкія магчымасці якіх абмежаваны (дзіцячыя калектывы, аматарскія і вучэбныя хары і ансамблі розных складаў). Увага да стылявой і выканальніцкай спецыфікі фалькл. арыгінала патрабуе захавання яго асновы (напеву ці найгрыша, ладагарманічных асаблівасцей, тыпу шматгалосся) і дапускае частковае змяненне структуры (транспаніраванне ў зручную танальнасць, аб'яднанне аднафункцыянальных галасоў, замена гарманічных інтэрвалаў на меладычныя і інш.). П е р а л а ж э н н е для іншага, у параўнанні з арыгіналам, складу інструментаў ці галасоў. Такая А. ствараецца з улікам стылявых канстант узораў розных жанраў і гістарычных пластоў (напр., прынцыповае аднагалоссе твораў ранитрадыцыйных — абрадавых, калыханак, галашэнняў, лірычных; у познатрадыцыйных — розныя формы шматгалосся).

*Літ.*: М е д в е д е в а М.В. Методика хоровой аранжировки для руководителей песенных фольклорных коллективов. М., 1982; Я е ж. Аранжировка как вид творческой деятельности // Фольклор и фольклоризм. Л., 1989. Вып. 2. Традиционный фольклор и современные народные хоры и ансамбли.
*Т. Б. Варфаламеева.*

**АРÁНЧЫЦКІ НАРÓДНЫ ФАЛЬКЛÓРНЫ ГУРТ «БАБІНА ЛÉТА»** с е л ь с к а г а Д о м а к у л ь т у р ы П р у ж а н с к а г а р а ё н а. Заснаваны ў 1989, з 2002 народны. Кіраўнік Т.Пушко. У рэпертуары нар. песні, запісаныя ў мясцовых жыхароў: «У лесе каліна, дубок зэлененькі», «Вецер — з поля, хваля — з мора», «А ў гародзе вэрба расла», «Вэрба, вэрба», «Ой, даўно, даўно», «Ой, пасеяў козак грэчку», «Не ні, чумак, гарэлкі», «Ой, жураўка, жураўко», «Як я была мала, мала», «Ой, за гаем зеленэнькім», «Ой, там у полі, у полі», «Гуляла дэвчына», «З-за сонца нэ бачу», «Ой, ляцелі галкі», «Рабіна, рабінaчка» і інш. Форма выканання а капэла. Калектыў — удзельнік Міжнароднага свята «Купалле» (мястэчка Белая Вежа, Польшча, 1994), дыпламант рэгіянальнага фалькл.-этнаграфічнага фестывалю «Талакуха на Бярэсці» (2001). Прымаў удзел у тэлеперадачы «Оеразовы» (1996), мясцовы абрад «Каравай» запісаны на Бел. тэлебачанні.
*С. С. Авадок.*

**АРÁЦЫІ** (ад лац. oro гавару), празаічны жанр у шматмоўнай літаратуры і



*Аранчыцкі народны фальклорны гурт «Бабіна лета».*